КАНТРОЛЬНЫЙ ЭКЗЕМПЛЯР

Установа адукацыі
«Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка»

ЗАЦВЯРДЖАЮ
Прарэктар па вучэбнай рабоце
______________ С.І.Васілец
«___» ____________2023 г.
Рэгістрацыйны № УД-___/вуч. УД 26-1-№36-2023/уч.

**ГІСТОРЫЯ БЕЛАРУСІ**
**(1918 – 1939 гг.)**

Вучэбная праграма ўстановы вышэйшай адукацыі па вучэбнай дысцыпліне для спецыяльнасцей:
1-02 01 01 Гісторыя і грамадазнаўчыя дысцыпліны;
1-02 01 02 Гісторыя і сусветная мастацкая культура;
1-02 01 03 Гісторыя і экскурсійна-краязнаўчая работа

2023 г.

Вучэбная праграма складзена на падставе тыпавой вучэбнай праграмы (___________202_____, № ________/ ________) і вучэбных планаў спецыяльнасцей: 1-02 01 01 Гісторыя і грамадазнаўчыя дысцыпліны; 1-02 01 02 Гісторыя і сусветная мастацкая культура; 1-02 01 03 Гісторыя і экскурсійна-краязнаўчая работа

**СКЛАДАЛЬНІК:**
З.І. Канапацкая, дацэнт кафедры гісторыі Беларусі і славянскіх народаў БДПУ, кандыдат гістарычных навук.

**РЭЦЭНЗЕНТЫ:**
У.М. Кадзіра – першы прарэктар прыватнай установы адукацыі «Інстытут сучасных ведаў імя А.М. Шырокава», кандыдат гістарычных навук, дацэнт

І.В.Варывончык – прафесар кафедры ўсеагульнай гісторыі і методыкі выкладання гісторыі ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка», доктар гістарычных навук, прафесар

**УЗГОДНЕНА:**
Дырэктар дзяржаўнай установы адукацыі
«Гімназія № 40 г.Мінска імя Я.Лучыны» І.А.Бабкоў

**РЭКАМЕНДАВАНА ДА ЗАЦВЯРДЖЭННЯ:**

Кафедрай гісторыі Беларусі і славянскіх народаў
(пратакол № 10 ад 21.03.2023).
Загадчык кафедры С.А.Талмачова

Навукова-метадычным саветам установы вышэйшай адукацыі "Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка"
(пратакол № 5 ад 18.04. 2023).

Афармленне вучэбнай праграмы і суправаджальных яе матэрыялаў дзеючым патрабаванням Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь адпавядае.

Метадыст
вучэбна-метадычнага аддзела БДПУ Г.В.Вінаградава

Дырэктар бібліятэкі Н.П.Сяткоўская

# ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Вучэбная праграма па вучэбнай дысцыпліне «Гісторыя Беларусі (1918-1939 гг.)» распрацавана на падставе тыпавой вучэбнай праграмы для ўстаноў вышэйшай адукацыі Рэспублікі Беларусь у адпаведнасці з патрабаваннямі адукацыйнага стандарта вышэйшай адукацыі першай ступені па спецыяльнасцях 1-02 01 01 «Гісторыя і грамадазнаўчыя дысцыпліны», 1-02 01 02 «Гісторыя і сусветная мастацкая культура», 1-02 01 03 «Гісторыя і экскурсійна-краязнаўчая работа».

Шматвекавая гісторыя Беларусі ўяўляе важную складовую частку славянскай, еўрапейскай і сусветнай цывілізацый і займае вядучае месца ў сістэме гуманітарнай падрыхтоўкі студэнцкай моладзі нашай краіны. Сваёй непаўторнай, гераічнай і трагічнай гісторыяй беларускі народ можа ганарыцца. Менавіта гістарычныя веды адыгрываюць важную ролю ў фарміраванні нацыянальнай самасвядомасці. Без ведання ўласнай гісторыі немагчыма забяспечыць росквіт краіны і прагназаваць яе развіццё.

Вучэбная дысцыпліна «Гісторыя Беларусі (1918-1939 гг.)» накіравана на вывучэнне сацыяльна-эканамічнага, дзяржаўна-палітычнага, знешнепалітычнага і культурнага развіцця Беларусі з 1918 па 1939 г. Праграма па дысцыпліне распрацавана з улікам дасягненняў сучаснай гістарыяграфіі і на падставе спалучэння розных падыходаў да вывучэння гістарычнага працэсу.

Вучэбная дысцыпліна «Гісторыя Беларусі (1918-1939 гг.)» грунтуецца на ведах, атрыманых пры вывучэнні наступных дысцыплін спецыяльнасці: «Гісторыя Беларусі (1861 – 1918 гг.)», «Гісторыя Расіі і Ўкраіны (1900 – 1917 гг.)», «Культура Беларусі (XIX – пачатак XXI ст.)», Гэта дае магчымасць акцэнтаваць увагу студэнтаў на міждысцыплінарных сувязях, выявіць ролю і месца гісторыі этнасу Беларусі ў шырокім прасторавым і часавым дыяпазоне.

**Мэтай** вывучэння вучэбнай дысцыпліны «Гісторыя Беларусі (1918-1939 гг.)» з’яўляецца фарміраванне ў студэнтаў фундаментальных ведаў па гісторыі Беларусі 1918-1939 гг. і выхаванне на гэтай аснове пачуцця прыналежнасці да лёсу краіны і яе гісторыі.

Для рэалізацыі вызначанай мэты прадугледжваецца вырашэнне наступных **задач**:

– высветліць прычынна-выніковыя сувязі і заканамернасці гістарычнага развіцця беларускага народа ў кантэксце еўрапейскай і сусветнай гісторыі;

– садзейнічаць усведамленню студэнтамі сістэмы матэрыяльных, культурных і духоўных каштоўнасцей беларускага народа, якія служаць падмуркамдля аналізу сучаснасці і вызначэння перспектыў будучай жыццядзейнасці;

– забяспечыць атрыманне тэарэтычных і практычных ведаў, якія дазволяць студэнтам правільна аналізаваць падзеі і факты гісторыі, рабіць неабходныя высновы і абагульненні;

– спрыяць фарміраванню падрыхтаванасці выпускніка вышэйшай школы як грамадзяніна Рэспублікі Беларусь;

– стварыць неабходныя ўмовы для фарміравання ў студэнтаў пачуццяў прыналежнасці да гісторыка-культурнай спадчыны беларускага народа і адказнасці за яе захаванне;

– садзейнічаць усведамленню студэнтамі неабходнасці захавання дзяржаўнага суверэнітэту і выхаванню ў іх патрыятызму;

– з дапамогай вывучэння зместу вучэбнай дысцыпліны спрыяць фарміраванню ў студэнтаў навуковага светапогляду;

– сфарміраваць навукова катэгарыяльны і паняційны апарат па вучэбнай дысцыпліне.

– У выніку вывучэння вучэбнай дысцыпліны студэнт павінен

**ведаць:**

– асноўныя падзеі і факты ў гісторыі Беларусі 1918-1939 гг.;

– асаблівасці эканамічнага, сацыяльнага, палітычнага і культурнага развіцця Беларусі ў адзначаны перыяд;

– асаблівасці фарміравання і станаўлення беларускай дзяржаўнасці ў кантэксце сусветных падзей;

**умець:**

– выкарыстоўваць метадалогію гістарычнай навукі для аналізу гістарычнага развіцця беларускага народа;

– выяўляць асноўныя тэндэнцыі сацыяльна-эканамічнага і палітычнага развіцця края;

– выкарыстоўваць гістарычны вопыт для аналіза і ацэнкі сучасных праблем у развіцці Беларусі.

**валодаць:**

– спосабамі адбору і сістэматызацыі гістарычнай інфармацыі;

– метадамі, формамі і сродкамі аптымізацыі, рацыяналізацыі і інтэнсіфікацыі адукацыйнага працэсу.

Вывучэнне вучэбнай дысцыпліны «Гісторыя Беларусі (1918-1939 гг.)» павінна забяспечыць фарміраванне ў студэнтаў універсальных і базавых прафесійных кампетэнцый:

УК-9. Выяўляць фактары і механізмы гістарычнага развіцця, вызначаць грамадскае значэнне гістарычных падзей.

БПК-15. Выдзяляць асноўныя перыяды, тэндэнцыі і заканамернасці сацыяльных, эканамічных, палітычных, этна-нацыянальных, рэлігійна-канфесійных і культурных падзей і працэсаў, якія праходзілі на тэрыторыі Беларусі.

Пры вывучэнні кожнай тэмы студэнты павінны навучыцца карыстацца як канкрэтна-гістарычнымі метадамі (гісторыка-генетычным, гісторыка-параўнальным, гісторыка-тыпалагічным, гісторыка-сістэмным і інш.), так і агульнанавуковымі (індукцыі і дэдукцыі, аналізу і сінтэзу, узыходжання ад канкрэтнага да абстрактнага і наадварот, аналогіі і інш.) метадамі пазнання.

На вывучэнне вучэбнай дысцыпліны «Гісторыя Беларусі (1918–1939 гг.)» вучэбным планам адведзена ўсяго 106 гадзін (3 зал. адз.), з іх: аўдыторных – 58 гадзін: 24 гадзіны – лекцыйныя заняткі, 34 гадзіны – семінарскія заняткі (кіруемая самастойная работа – 6 гадзін, іх 2 гадзіны лекцый і 4 гадзіны семінарскія заняткі), на самастойную работу – 48 гадзін, экзамен у 6 семестры.

На завочнай форме атрымання адукацыі па спецыяльнасці 1-02 01 01 «Гісторыя і грамадазнаўчыя дысцыпліны» вучэбным планам адведзена ўсяго 108 гадзін (3 зал. адз.), з іх аўдыторных – 14 гадзін (6 гадзін – лекцыйных заняткаў, 8 гадзін – семінарскіх заняткаў), экзамен на 4 курсе.

## ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА МАТЭРЫЯЛУ

### Тэма 1. Утварэнне БССР

Гістарыяграфія пытання. Палітычныя перадумовы стварэння беларускай савецкай дзяржаўнасці. Роля Беларускага нацыянальнага камісарыята пры Наркамаце па справах нацыянальнасцей РСФСР і беларускіх секцый ў РКП(б). Пазіцыя па беларускім пытанні Аблвыканкамзаха і Паўночна-заходняга абласнога камітэта РКП(б). Супярэчнасці працэсу станаўлення беларускай савецкай дзяржаўнасці. Прыняцце вышэйшымі партыйнымі органамі рашэння аб стварэнні БССР. VI абласная канферэнцыя бальшавіцкай партыі. Абвяшчэнне БССР. Утварэнне КП(б) Беларусі. Стварэнне Часовага рабоча-сялянскага ўрада БССР. Вызначэнне тэрыторыі БССР. Уключэнне Віцебскай і Магілёўскай губерняў у склад РСФСР. I з’езд Саветаў БССР, яго рашэнні. Першая Канстытуцыя БССР. Прыняцце рашэння аб стварэнні Літоўска-Беларускай ССР (ЛітБел). Скасаванне Літоўска-Беларускай ССР. Сацыяльна-эканамічныя пераўтварэнні на савецкай частцы тэрыторыі Беларусі ў 1918–1920 гг. Палітыка “ваеннага камунізму” і асаблівасці яе ажыццяўлення. Нацыяналізацыя прамысловасці. Надзяленне сялян зямлёй. Харчразвёрстка, яе эканамічныя і сацыяльныя вынікі. Камбеды ў Беларусі. Адносіны насельніцтва да палітыкі “ваеннага камунізму». Сялянскія хваляванні і антысавецкія выступленні, выкліканыя харчразвёрсткай, мабілізацыямі ў Чырвоную Армію. Падаўленне антысавецкіх выступленняў, кантрыбуцыі. Мяцеж У.В. Стракапытава ў Гомелі.

### Тэма 2. Савецка-польская вайна на тэрыторыі Беларусі

Гістарыяграфія пытання. Наступленне польскіх войскаў, акупацыя тэрыторыі Беларусі. Палітыка польскага кіраўніцтва ў дачыненні да БНР, беларускага нацыянальнага руху. Раскол у беларускім грамадска-палітычным руху па пытаннях рэалізацыі ідэі беларускай дзяржаўнасці. Беларускія эсэры аб “трэцім шляху” для Беларусі. Арганізацыя “Маладая Беларусь”. Стварэнне Беларускай камуністычнай арганізацыі. У.Ігнатоўскі. Супраціўленне беларускага народа польскім акупантам. Супрацоўніцтва беларускіх эсэраў і камуністычных арганізацый у барацьбе супраць польскіх акупантаў. Беларускі паўстанчы камітэт і падрыхтоўка паўстання. Народная ваенная самаахова (НВС). Наступленне Чырвонай арміі летам і восенню 1920 г. Контрнаступленне польскіх войскаў.

### Тэма 3. Аднаўленне савецкай улады на вызваленай тэрыторыі

Дэкларацыя аб абвяшчэнні незалежнасці Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі Беларусь (ССРБ). Слуцкае паўстанне. Барацьба супраць савецкай улады атрадаў С.Булак-Балаховіча. Ліквідацыя фарміраванняў С.Булак-Балаховіча, іншых антысавецкіх выступленняў. Заканчэнне савецка-польскай вайны на тэрыторыі Беларусі. Няўдачы Чырвонай Арміі на завяршальным этапе вайны. Рыжскі мірны дагавор і яго вынікі для Беларусі.

**Тэма 4. Умовы пераходу ад вайны да міру. Нацыянальна-дзяржаўнае будаўніцтва**

Эканамічнае і палітычнае становішча Беларусі пасля заканчэння вайны, на пачатку 20-х гадоў. Крызіс палітыкі "ваеннага камунізму". Абвастрэнне сацыяльнай напружанасці. Антысавецкая барацьба ў памежных з Польшчай раёнах. Падрыхтоўка антыбальшавіцкага і антыпольскага паўстання. Увядзенне ваеннага становішча ў Беларусі. Падаўленне антысавецкіх выступленняў. Тэрыторыя і насельніцтва БССР у пачатку 20-х гадоў. Нацыянальны склад насельніцтва. Міграцыя насельніцтва, эвакуацыя і рээвакуацыя. Нелегальныя гандлёвыя зносіны, кантрабанда. Абмежаванасць эканамічных магчымасцей савецкай улады, матэрыяльных рэсурсаў. Пошукі шляхоў выхаду з крызісу. Пагадненні БССР з РСФСР і іншымі рэспублікамі. Удзел БССР у стварэнні СССР. IV Усерасійскі з'езд Саветаў. Падпісанне Дагавору аб стварэнні СССР. Статус БССР у складзе СССР.

**Тэма 5. Прамысловасць Беларусі ў 20–30-я гг. XX ст.**

Стан прамысловасці БССР пасля пераходу да мірных умоў развіцця. Змены ў арганізацыі кіравання прамысловымі прадпрыемствамі ва ўмовах іх дзейнасці пры пераходзе да НЭПу. Ліквідацыя глаўкаў і стварэнне трэстаў, сіндыкатаў. Перавод прамысловасці на гаспадарчы разлік. Арэнда прамысловых прадпрыемстваў. Асноўныя галіны прамысловасці Беларусі. Галоўныя вынікі аднаўленчага перыяду ў прамысловасці. Першы пяцігадовы план у прамысловасці Беларусі. З'яўленне новых галін вытворчасці. Вяртанне да камандна-адміністрацыйнай сістэмы, жорсткага планавання. Метады і сродкі выканання заданняў пяцігадовага плана. Гаспадарчыя вынікі першай пяцігодкі ў БССР. Прамысловасць Беларусі ў гады другой пяцігодкі. Заданні па прамысловым развіцці. Новабудоўлі, тэхнічная рэканструкцыя вытворчасці. Абвастрэнне цяжкасцей з выкананнем пяцігадовага плана. Зніжэнне тэмпаў развіцця ў БССР. Асноўныя вынікі II пяцігодкі ў Беларусі. Прамысловасць Беларусі ў агульнасаюзным гаспадарчым комплексе.

**Тэма 6. Сельская гаспадарка Беларусі ў 20–30-я гг. XX ст.**

Становішча ў сельскай гаспадарцы Беларусі на пачатку 20-х гадоў. Пераход да новай эканамічнай палітыкі. Замена харчразвёрсткі харчовым падаткам. Дэкрэт аб вольным выбары формаў землекарыстання. Хутары ў Беларусі. Калектыўнае землекарыстанне. Закон Аб арэндзе зямлі. Дазвол найму рабочай сілы. Рост крэдытнай спажывецкай кааперацыі. Вынікі НЭПа ў сельскай гаспадарцы. Змена палітыкі камуністычнай партыі ў вёсцы. Курс на калектывізацыю. Крызіс хлебанарыхтовак. Увядзенне надзвычайных мер. Канфіскацыя хлеба ў сялянства. Забарона гандлю сельгаспрадуктамі. Забарона хутарской формы землеўладкавання. Пачатак суцэльнай калектывізацыі. Тэрміны яе правядзення для Беларусі. Роля кіраўніцтва КП(б)Б у паскарэнні калектывізацыі. Забарона арэнды зямлі і найма рабочай сілы. Ліквідацыя "кулацкіх" гаспадарак, прымусовае ўступленне сялян у калгасы. Адток сялянскіх гаспадарак з калгасаў вясной 1930 г. Новы наступ

на сялянства восенню 1930 г. Калектывізацыя беларускай вёскі на працягу першай паловы 30-х гг.. "Раскулачванне", прымусовыя высылкі, рэпрэсіі. Арганізацыя МТС. Голад 1932–1933 гг. у Беларусі. Вынікі калектывізацыі сельскай гаспадаркі Беларусі.

**Тэма 7. Грамадска-палітычнае жыццё Беларусі ў 20–30-я гг. ХХ ст.**

Гістарыяграфія пытання. Асноўныя тэндэнцыі ў грамадска-палітычным жыцці Беларусі. Сістэма савецкай улады. Актывізацыя дзейнасці Саветаў у пачатку 20-х гадоў. Праявы дэмакратызму ў дзейнасці грамадска-палітычных арганізацый у першай палове 20-х гг.. Прафесійныя саюзы Беларусі. Утварэнне камсамола ў Беларусі. Кампартыя Беларусі ў 20-я гады. Роля кампартыі ў жыцці беларускага грамадства. Самароспуск партыі беларускіх эсэраў. Утварэнне аднапартыйнай сістэмы. Канстытуцыя БССР 1927 г. Адміністрацыйна-тэрытарыяльная рэформа. Вяртанне ў склад БССР усходніх тэрыторый. Нацыянальныя раёны і Саветы ў Беларусі. Палітыка беларусізацыі ў дзейнасці дзяржаўных і грамадскіх арганізацый. Перавод на беларускую мову справаводства ў дзяржаўных установах. Палітыка карэнізацыі. Праявы палітыкі беларусізацыі ў войску. Супярэчнасці і цяжкасці ў правядзенні палітыкі беларусізацыі. Змены палітыкі Кампартыі ў адносінах да беларусізацыі ў канцы 20-х гадоў. Карэнныя змены грамадска-палітычнага жыцця ў канцы 20-х гадоў. Умацаванне таталітарнай тэндэнцыі ў палітыцы Кампартыі. Тэзіс аб узмацненні класавай барацьбы. Пашырэнне барацьбы з іншадумствам. Стварэнне рэпрэсіўнага апарату, пазасудовых органаў. Пераход да барацьбы з беларускім нацыянал-дэмакратызмам (нацдэмамі). Справа "Саюза вызвалення Беларусі". Масавы характар рэпрэсій 1937–1938 гг. у Беларусі. Рэпрэсіі ўнутры КП(б)Б. Трагічны лёс кіраўнікоў рэспублікі.

**Тэма 8. Культурнае жыццё ў БССР**

Палітыка Савецкай улады і кіраўнікоў Кампартыі па пытаннях развіцця нацыянальнай культуры ў Беларусі. Уплыў палітыкі беларусізацыі на актывізацыю нацыянальна-культурнага жыцця. Станаўленне і развіццё ў Беларусі савецкай сістэмы адукацыі. Барацьба з непісьменнасцю. Стварэнне агульнаадукацыйнай, спецыяльнай і вышэйшай школы. Праявы палітыкі беларусізацыі ў сферы адукацыі. Забеспячэнне культурных патрэб нацыянальных меншасцей. Фарміраванне беларускай інтэлігенцыі і рэпрэсіі ў адносінах да яе. Развіццё беларускай савецкай літаратуры. Умовы літаратурнай дзейнасці ў пачатку 20-х гг.. Праявы адноснай дэмакратызацыі грамадска-палітычнага жыцця ў творчай дзейнасці. Стварэнне і дзейнасць літаратурных аб'яднанняў "Маладняк", "Узвышша", "Полымя". Беларуская асацыяцыя пралетарскіх пісьменнікаў. Асноўныя тэмы ў творах 20–30 гг. Я.Купалы, Я.Коласа, М.Чарота, З.Бядулі, К.Чорнага, М.Зарэцкага, А.Дудара і іншых беларускіх літаратараў. Перабудова пісьменніцкіх арганізацый. Рэпрэсіі ў адносінах да беларускіх пісьменнікаў. Тэатральнае, музычнае і выяўленчае мастацтва Савецкай Беларусі. Рэпертуар тэатраў у Беларусі,

тэматыка твораў мастакоў, кінарэжысёраў. Культурна-асветніцкая работа. Беларуская народная творчасць. Абмежаванасць працэсу нацыянальнага культурнага развіцця ў 30-я гады.

**Тэма 9. Навука і адукацыя ў 20–30-я гг. ХХ ст.**

Навука ў БССР. Стварэнне сістэмы навуковых устаноў. Заснаванне і дзейнасць Інбелкульта. Разгортванне навуковых даследаванняў па пытаннях беларускай мовы, гісторыі, этнаграфіі. Стварэнне Акадэміі навук БССР. У. Ігнатоўскі, С.Некрашэвіч, В.Ластоўскі, У.Пічэта, І.Замоцін і іншыя вучоныя Беларусі. Галоўныя навуковыя цэнтры Беларусі ў 30-я гады. Здабыткі і страты беларускай навукі. Рэпрэсіі ў адносінах да вучоных.

Станаўленне і развіццё ў Беларусі савецкай сістэмы адукацыі. Барацьба з непісьменнасцю. Стварэнне агульнаадукацыйнай, спецыяльнай і вышэйшай школы. Праявы палітыкі беларусізацыі ў сферы адукацыі. Забеспячэнне культурных патрэб нацыянальных меншасцей.

**Тэма 10. Беларускае замежжа ў міжваенны перыяд**

Беларуская эміграцыя як частка беларускай нацыі. Палітычныя і эканамічныя падставы для эміграцыі з Беларусі. З’яўленне арганізаванай палітычнай эміграцыі, яе памеры і асноўныя накірункі. Адносіны лідэраў беларускай эміграцыі да Рыжскага міру, адстойванне ідэі незалежнасці Беларусі. Адносіны беларускай эміграцыі да Савецкай Беларусі. Кантакты кіраўнікоў БССР з эміграцыяй. Уплыў амністыі, палітыкі беларусізацыі, гаспадарчых поспехаў у БССР на пазіцыі беларускай эміграцыі. Раскол у беларускай эміграцыі. Канферэнцыя ў Берліне (1925 г.) і яе вынікі. Рух за вяртанне. Уключэнне былых эмігрантаў у нацыянальна-культурнае адраджэнне на савецкай частцы Беларусі. Рэпрэсіі ў адносінах да беларускіх дзеячаў, якія вярнуліся з эміграцыі. Кіруючыя органы беларускай эміграцыі ў другой палове 20-х і ў 30-я гг. ХХ ст. Нацыянальна-культурная дзейнасць беларускай эміграцыі. Выдавецкая дзейнасць. Студэнцкія аб’яднанні. Роля беларускай эміграцыі ў захаванні нацыянальнай спадчыны.

**Тэма 11. Заходняя Беларусь у складзе Польскай дзяржавы**

Заходнебеларускія землі ў складзе Польскай дзяржавы. Палітыка польскіх улад у адносінах да Заходняй Беларусі, нацыянальных праблем беларусаў. Рост беспрацоўя. Рабочы рух у Заходняй Беларусі. Аграрнае пытанне ў Заходняй Беларусі. Зямельная рэформа, парцэляцыя, камасацыя, ліквідацыя сервітутаў. Асадніцтва. Збядненне беларускага сялянства. Эканамічная эміграцыя. Нацыянальны прыгнёт беларускага насельніцтва. Таварыства беларускай школы (ТБШ), яго культурна-асветніцкая дзейнасць. Беларускі пасольскі клуб. Партыя беларускіх эсэраў на тэрыторыі Заходняй Беларусі. Стварэнне Беларускай рэвалюцыйнай арганізацыі (БРА). Беларуская сацыял-дэмакратычная партыя. Беларуская хрысціянская дэмакратыя. Беларускі сялянскі саюз (БСС). Утварэнне камуністычнай партыі Заходняй Беларусі (КПЗБ). Афармленне Беларускай сялянска-рабочай

грамады (БСРГ). Яе праграма, палітычная і арганізацыйная дзейнасць. Пераўтварэнне грамады ў масавую арганізацыю. Б.Тарашкевіч, С.Рак-Міхайлоўскі, П.Валошын, П.Мятла і іншыя кіраўнікі Беларускага нацыянальнага руху. Разгром і забарона БСРГ польскімі ўладамі. Выбары ў сейм (1928 г.) у Заходняй Беларусі. Беларускі сялянска-рабочы пасольскі клуб "Змаганне". Спробы стварэння антыфашысцкага народнага фронту. Беларускае народнае аб'яднанне (БНА). Роспуск КПЗБ, рэпрэсіі ў адносінах да яе кіраўнікоў. Культура Заходняй Беларусі. Школы, друк, літаратура і мастацтва. Творы М.Танка, М.Васілька, В.Таўлая, Я.Брыля, Б.Тарашкевіча, І.Дварчаніна і інш. Народная творчасць. Р.Шырма. Драматычныя секцыі пры гуртках ТБШ.

**ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНАЯ КАРТА**
**ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЫ «ГІСТОРЫЯ БЕЛАРУСІ (1918 -1939 ГГ.)»**
**(дзённая форма атрымання адукацыі)**

| Нумар тэмы, занятку | Назва тэмы занятку, пералік пытанняў, якія вывучаюцца | Колькасць аўдыторных гадзін | | | Самастойная работа (пазааўдыторная) | Матэрыяльнае забеспячэнне занятку (наглядныя, метадычныя дапаможнікі і інш.) | Літаратура | Формы кантролю ведаў |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | Лекцыі | Практычныя (семінарскія) заняткі | Кіруемая самастойная работа студэнтаў | | | | |
| **6 семестр** | | | | | | | | |
| **1.** | | **22** | **30** | **6** | **48** | | | |
| 1 | **Утварэнне БССР**<br>1. Перадумовы стварэння беларускай савецкай дзяржаўнасці.<br>2. Роля Беларускага Нацыянальнага камісарыята.<br>3. IV Абласная канферэнцыя бальшавіцкай партыі. Абвяшчэнне БССР. Утварэнне КП(б)Б.<br>4. Стварэнне Літоўска-Беларускай ССР. Скасаванне ЛітБел.<br>5. Сацыяльна-эканамічныя пераўтварэнні на савецкай частцы тэрыторыі Беларусі ў 1918–1920 гг. Палітыка “ваеннага камунізму”.<br>6. Сялянскія хваляванні і антысавецкія выступленні. | 4 | 2 | 2(с) | 6 | Хрэстаматыя па гісторыі Беларусі, Дакументы і матэрыялы па гісторыі Беларусі | [1]<br>[2]<br>[3] | Канспект |
| 2 | **Савецка-польская вайна на тэрыторыі Беларусі**<br>1. Мэты польска-савецкай вайны 1919–1920 гг. | 2 | 4 | | 4 | Прэзентацыя «Савецка- | [1]<br>[2] | Вуснае апытанне |

| | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | 2. Польскі акупацыйны рэжым на тэрыторы Беларусі.<br>3. Раскол у беларускім грамадска-палітычным руху.<br>4. Барацьба супраць польскай акупацыі. | | | | | польская вайна» | [3] | |
| 3 | **Аднаўленне савецкай улады на вызваленай тэрыторыі**<br>1. Ваенныя падзеі на тэрыторыі Беларусі.<br>2. Дэкларацыя аб абвяшчэнні незалежнасці Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі Беларусь (ССРБ).<br>3. Слуцкае паўстанне.<br>4. Рыжскі мірны дагавор і яго вынікі для Беларусі. | 2 | 4 | | 4 | Хрэстаматыя па гісторыі Беларусі, Дакументы і матэрыялы па гісторыі Беларусі | [1]<br>[2]<br>[3] | Рэйтынгавая кантрольная работа № 1 |
| 4 | **Умовы пераходу ад вайны да міру. Нацыянальна-дзяржаўнае будаўніцтва**<br>1. Эканамічнае і палітычнае становішча Беларусі пасля заканчэння вайны.<br>2. Крызіс палітыкі ваеннага камунізму.<br>3.Абвастрэнне сацыяльнай напружанасці.<br>4. Падпісанне дагавору аб стварэнні СССР. Статус БССР у складзе СССР. | 2 | 2 | | 4 | Хрэстаматыя па гісторыі Беларусі, Дакументы і матэрыялы па гісторыі Беларусі | [1]<br>[3] | Абарона прэзентацый |
| 5 | **Прамысловасць Беларусі ў 20–30-я гг. XX ст.**<br>1. Стан прамысловасці БССР пасля пераходу да мірных умоў развіцця.<br>2.Асноўныя галіны прамысловасці Беларусі.<br>3. Першы пяцігадовы план.<br>4. З’яўленне новых галін вытворчасці. | 2 | 2 | | 4 | Прэзентацыя «Асноўныя галіны прамысловасці Беларусі ў 20–30-я гады XX ст.» | [1]<br>[1]<br>[3] | |
| 6 | **Сельская гаспадарка Беларусі ў 20—30-я гг. XX ст.**<br>1. Становішча сельскай гаспадаркі Беларусі на пачатку 20-х гг.<br>2. Пераход да НЭПа.<br>3.Ліквідацыя “кулацкіх” гаспадарак.<br>4. Калектывізацыя беларускай вёскі. | 2 | 2 | | 4 | Хрэстаматыя па гісторыі Беларусі, Дакументы і матэрыялы па гісторыі Беларусі. | [1]<br>[2] | Даклады |

| | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 7 | **Грамадска-палітычнае жыццё Беларусі ў 20–30-я гг. XX ст.**<br>1. Актывізацыя дзейнасці саветаў у пачатку 20-х гг. Прафсаюзы Беларусі.<br>2. Роля кампартыі ў жыцці беларускага грамадства. Канстытуцыя БССР 1927 г.<br>3. Палітыка беларусізацыі ў дзейнасці дзяржаўных і грамадскіх арганізацый. Палітыка карэнізацыі.<br>4. Карэнныя змены грамадска-палітычнага жыцця ў канцы 20-х гг. Умацаванне таталітарнай тэндэнцыі ў палітыцы Кампартыі.<br>5. Масавы характар рэпрэсій 1937–1938 гг. | 2 | 4 | | 4 | Хрэстаматыя па гісторыі Беларусі, Дакументы і матэрыялы па гісторыі Беларусі | [1]<br>[2]<br>[3] | Рэйтынгавая кантрольная работа № 2 |
| 8 | **Культурнае жыццё ў БССР**<br>1. Палітыка Савецкай улады і кіраўнікоў Кампартыі па пытаннях развіцця нацыянальнай культуры.<br>2. Уплыў палітыкі беларусізацыі на актывізацыю культурнага жыцця.<br>3. Развіццё беларускай савецкай літаратуры. | 2 | 4 | | 6 | Прэзентацыя «Палітыка беларусізацыі» | [1]<br>[2]<br>[3] | Падрыхтоўка і абарона прэзентацый |
| 9 | **Навука і адукацыя ў 20–30-я гг. XX ст.**<br>1. Навука ў БССР.<br>2. Разгортванне навуковых даследаванняў.<br>3. Развіццё ў Беларусі савецкай сістэмы адукацыі. | | 2 | 2 (л) | 4 | Прэзентацыя «Навука ў БССР» | [1]<br>[2]<br>[3] | Падрыхтоўка і абарона прэзентацый |
| 10 | **Беларускае замежжа ў міжваенны перыяд**<br>1. Беларуская эміграцыя як частка беларускай нацыі.<br>2. Раскол беларускай эміграцыі.<br>3. Рух за вяртанне.<br>4. Нацыянальна-культурная дзейнасць эміграцыі. | 2 | 2 | | 4 | Прэзентацыя «Беларуская эміграцыя як частка беларускай нацыі» | [1]<br>[2]<br>[3] | Даклады, вуснае апытанне |

| | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 11 | **Заходняя Беларусь у складзе Польскай дзяржавы**<br>1. Рабочы рух у Заходняй Беларусі. Аграрнае пытанне ў Заходняй Беларусі. Беларускі пасольскі клуб.<br>2. Таварыства беларускай школы (ТБШ), яго культурна-асветніцкая дзейнасць.<br>3. Беларускі нацыянальны рух на тэрыторыі Заходняй Беларусі.<br>4. Дзейнасць камуністычнай партыі Заходняй Беларусі (КПЗБ). Роспуск КПЗБ, рэпрэсіі ў адносінах да яе кіраўнікоў.<br>5. Культура Заходняй Беларусі. | 2 | 2 | 2(с) | 4 | Карта «Заходняя Беларусь у складзе Польскай дзяржавы» | [1]<br>[2]<br>[3] | Падрыхтоўка і абарона паведамленняў |
| | **Усяго** | **22** | **30** | **6** | **48** | | | **Экзамен** |

**ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНАЯ КАРТА ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЫ**
**«ГІСТОРЫЯ БЕЛАРУСІ (1918 -1939 ГГ.)»**
(завочная форма атрымання адукацыі)

| Нумар тэмы, занятку | Назва тэмы, занятку, пералік пытанняў, якія вывучаюцца | Колькасць аўдыторных гадзін | | Матэрыяльнае забеспячэнне занятку (наглядныя, метадычныя дапаможнікі і інш.) | Літаратура | Формы кантролю ведаў |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | | Лекцыі | Практычныя (семінарскія) заняткі | | | |
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 |
| 1. | **Утварэнне БССР**<br>1. Перадумовы стварэння беларускай савецкай дзяржаўнасці.<br>2. Роля Беларускага Нацыянальнага камісарыята.<br>3. IV Абласная канферэнцыя бальшавіцкай партыі. Абвяшчэнне БССР. Утварэнне КП(б)Б.<br>4. Стварэнне Літоўска-Беларускай ССР. Скасаванне ЛітБел.<br>5. Сацыяльна-эканамічныя пераўтварэнні на савецкай частцы тэрыторыі Беларусі ў 1918–1920 гг. Палітыка "ваеннага камунізму".<br>6. Сялянскія хваляванні і антысавецкія выступленні. | 2 | 2 | Хрэстаматыя па гісторыі Беларусі, Дакументы і матэрыялы па гісторыі Беларусі | [1]<br>[2]<br>[3] | Канспект |
| 2. | **Умовы пераходу ад вайны да міру. Нацыянальна-дзяржаўнае будаўніцтва**<br>1. Эканамічнае і палітычнае становішча Беларусі пасля заканчэння вайны.<br>2. Крызіс палітыкі ваеннага камунізму.<br>3.Абвастрэнне сацыяльнай напружанасці.<br>4. Падпісанне дагавору аб стварэнні СССР. Статус | 2 | 2 | Хрэстаматыя па гісторыі Беларусі, Дакументы і матэрыялы па гісторыі Беларусі | [1]<br>[2]<br>[3] | Абарона прэзентацый |

| | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | БССР у складзе СССР. | | | | | |
| 3. | **Грамадска-палітычнае жыццё Беларусі ў 20–30-я гг. ХХ ст.**<br>1. Актывізацыя дзейнасці саветаў у пачатку 20-х гг. Прафсаюзы Беларусі.<br>2. Роля кампартыі ў жыцці беларускага грамадства. Канстытуцыя БССР 1927 г.<br>3. Палітыка беларусізацыі ў дзейнасці дзяржаўных і грамадскіх арганізацый. Палітыка карэнізацыі.<br>4. Карэнныя змены грамадска-палітычнага жыцця ў канцы 20-х гадоў. Умацаванне таталітарнай тэндэнцыі ў палітыцы Кампартыі.<br>5. Масавы характар рэпрэсій 1937 – 1938 гг. | 2 | 2 | Хрэстаматыя па гісторыі Беларусі, Дакументы і матэрыялы па гісторыі Беларусі | [1]<br>[2]<br>[3] | Вуснае апытанне |
| 4. | **Заходняя Беларусь у складзе Польскай дзяржавы**<br>1. Рабочы рух у Заходняй Беларусі. Аграрнае пытанне ў Заходняй Беларусі. Беларускі пасольскі клуб.<br>2. Таварыства беларускай школы (ТБШ), яго культурна-асветніцкая дзейнасць.<br>3. Беларускі нацыянальны рух на тэрыторыі Заходняй Беларусі.<br>4. Дзейнасць камуністычнай партыі Заходняй Беларусі (КПЗБ). Роспуск КПЗБ, рэпрэсіі ў адносінах да яе кіраўнікоў.<br>5. Культура Заходняй Беларусі. | | 2 | Карта «Заходняя Беларусь у складзе Польскай дзяржавы» | [1]<br>[2]<br>[3] | Праверка канспектаў |
| | **Усяго** | **6** | **8** | | | **Экзамен** |

# ІНФАРМАЦЫЙНА-МЕТАДЫЧНАЯ ЧАСТКА

## ЛІТАРАТУРА

**Асноўная літаратура**

1. Гісторыя беларускай дзяржаўнасці : вучэб. дапам. для студэнтаў устаноў вышэйш. адукацыі / І. А. Марзалюк [і інш.] ; пад агул. рэд. І. А. Марзалюка. – Мінск : Адукацыя і выхаванне, 2022. – 447 с.
2. История белорусской государственности : монография : в 5 т. / редкол.: А. А. Коваленя (гл. ред.) [и др.]. – Минск : Беларус. навука, 2018–2020. – Т. 3 : Белорусская государственность: от идеи к национальному государству (1917–1939). – 2019. – 641 с.

**Дадатковая літаратура**

1. Вішнеўскі, А. Ф. Гісторыя дзяржавы і права Беларусі ў дакументах і матэрыялах (са старажытныхчасоў да нашых дзен) : вучэб. дапам. / А. Ф. Вішнеўскі, Я. А. Юхо. – Мінск : Акад. М-ва ўнутр. спраў, 2003. – 320 с.
2. Гісторыя Беларусі : у 6 т. / рэдкал.: М. Касцюк (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : Экаперспектыва, 2007–2011. – Т. 5 : Беларусь у 1917–1945 гг. – 2007. – 613 с.
3. Гісторыя Беларусі [Электронны рэсурс] : вучэб.-метад. комплекс / склад.: М. М. Сакалоў [і інш.] // Репозиторий БГПУ. – Рэжым доступу: http://elib.bspu.by/handle/doc/249. – Дата доступу: 10.03.2023.
4. История Беларуси в контексте европейской цивилизации : учеб. пособие / С. А. Елизаров [и др.]. – 2 изд., испр. – Минск : Высш. шк., 2016. – 398 с.
5. История Беларуси в контексте мировых цивилизаций : учеб. пособие / В. И. Голубович [и др.] ; под ред. Н. И. Полетаевой, А. М. Сасим. – Минск : Экоперспектива, 2017. – 147 с.
6. Новик, Е. К. История Беларуси: с древнейших времен до 2013 г. : учеб. пособие для студентов высш. образования / Е. К. Новик, И. Л. Качалов, Н. Е. Новик ; под ред. Е. К. Новика. – 4-е изд., испр. и доп. – Минск : Выш. шк., 2013. – 558 с.
1. .

**Прыкладны спіс пытанняў да экзамену па вучэбнай дысцыпліне «Гісторыя Беларусі (1918 -1939 гг.)»**

1. Гістарыяграфія і крыніцы па гісторыі Беларусі перыяду 1918-1939 гг.
2. Палітычныя перадумовы стварэння беларускай савецкай дзяржаўнасці. Роля Беларускага нацыянальнага камісарыята пры Наркамаце па справах нацыянальнасцей РСФСР і беларускіх секцый ў РКП(б).
3. Гістарычнае месца БНР у працэсе стварэння беларускай дзяржаўнасці.
4. Размежаванні ў беларускім нацыянальным руху ўвясну 1918 г. Распад БСГ.
5. Барацьба за стварэнне БССР. Супярэчнасці працэсу станаўлення беларускай савецкай дзяржаўнасці.
6. VI абласная канферэнцыя бальшавіцкай партыі. Абвяшчэнне БССР. Утварэнне КП(б) Беларусі.
7. І з’езд Саветаў Беларусі. Утварэнне ЛітБелССР.
8. Сацыяльна-эканамічныя пераўтварэнні на савецкай частцы тэрыторыі Беларусі ў 1918–1920 гг. Палітыка «ваеннага камунізму» і асаблівасці яе ажыццяўлення.
9. Сялянскія хваляванні і антысавецкія выступленні, выкліканыя харчразвёрсткай, мабілізацыямі ў Чырвоную Армію.
10. Савецка-польская вайна на тэрыторыі Беларусі. Наступленне польскіх войскаў, акупацыя тэрыторыі Беларусі.
11. Становішча насельніцтва Беларусі ва ўмовах польскай акупацыі 1919–1920 гг.
12. Палітыка польскага кіраўніцтва ў дачыненні да БНР, беларускага нацыянальнага руху.
13. Арганізацыя «Маладая Беларусь». Стварэнне Беларускай камуністычнай арганізацыі. У.Ігнатоўскі.
14. Супраціўленне беларускага народа польскім акупантам.
15. Наступленне Чырвонай арміі летам і восенню 1920 г. Контрнаступленне польскіх войскаў.
16. Другое абвяшчэнне ССРБ.
17. Рыжскі мір і яго вынікі для Беларусі.
18. Слуцкае паўстанне. Барацьба супраць савецкай улады атрадаў С.Булак-Балаховіча.
19. Эканамічнае і палітычнае становішча Беларусі пасля заканчэння вайны ў пачатку 20-х гг. Крызіс палітыкі «ваеннага камунізму».
20. Тэрыторыя і насельніцтва БССР у пачатку 20-х гг. Нацыянальны склад насельніцтва.
21. Удзел БССР у стварэнні СССР. IV Усерасійскі з’езд Саветаў. Падпісанне Дагавору аб стварэнні СССР. Статус БССР у складзе СССР.
22. Неабходнасць перахода да Новай эканамічнай палітыкі.
23. Умовы перахода да НЭПа ў Беларусі.
24. Прамысловасць Беларусі ва ўмовах НЭПа. Галоўныя вынікі аднаўленчага перыяду ў прамысловасці.
25. Сельская гаспадарка Беларусі ва ўмовах НЭПа. Вынікі НЭПа ў сельскай гаспадарцы.
26. Прамысловасць Беларусі ў гады першых пяцігодак.

27. Калектывізацыя сельскай гаспадаркі ў БССР. Грамадска-палітычнае жыццё ў БССР у 1920-я гг. Умацаванне таталітарнай тэндэнцыі ў палітыцы Кампартыі 1930-я гг..
28. Асноўныя тэндэнцыі ў грамадска-палітычным жыцці Беларусі ў 20–30-я гг. XX ст. Сістэма савецкай улады. Актывізацыя дзейнасці Саветаў у пачатку 20-х гг.
29. Узбуйненне тэрыторыі БССР ў 20-я гг. XX ст.
30. Роля кампартыі ў жыцці беларускага грамадства. Самароспуск партыі беларускіх эсэраў. Утварэнне аднапартыйнай сістэмы. Канстытуцыя БССР 1927 г.
31. Нацыянальна-дзяржаўнае будаўніцтва ў БССР у 1920–1930 гг.
32. Палітыка беларусізацыі.
33. Станаўленне і развіццё ў Беларусі савецкай сістэмы адукацыі ў 20–30-я гг. --- XX ст.
34. Забеспячэнне культурных патрэб нацыянальных меншасцей ў 20–30-я гг. XX ст.
35. Развіццё беларускай савецкай літаратуры. Умовы літаратурнай дзейнасці ў пачатку 20-х гг.
36. Стварэнне і дзейнасць літаратурных аб'яднанняў «Маладняк», «Узвышша», «Полымя». Беларуская асацыяцыя пралетарскіх пісьменнікаў.
37. Асноўныя тэмы ў творах 20–30 гадоў Я.Купалы, Я.Коласа, М.Чарота, З.Бядулі, К.Чорнага, М.Зарэцкага, А.Дудара і іншых беларускіх літаратараў.
38. Рэпрэсіі ў адносінах да беларускіх пісьменнікаў ў 20–30-я гг. XX ст.
39. Тэатральнае, музычнае і выяўленчае мастацтва Савецкай Беларусі. Рэпертуар тэатраў у Беларусі, тэматыка твораў мастакоў, кінарэжысёраў ў 20–30-я гг. XX ст.
40. Абмежаванасць працэсу нацыянальнага культурнага развіцця ў 30-я гг..
41. Навука ў БССР ў 20–30-я гг. XX ст. Станаўленне і развіццё ў Беларусі савецкай сістэмы адукацыі. Праявы палітыкі беларусізацыі ў сферы адукацыі.
42. Стварэнне сістэмы навуковых устаноў. Заснаванне і дзейнасць Інбелкульта. Разгортванне навуковых даследаванняў па пытаннях беларускай мовы, гісторыі, этнаграфіі.
43. Стварэнне Акадэміі навук БССР. Галоўныя навуковыя цэнтры Беларусі ў 30-я гг.
44. Здабыткі і страты беларускай навукі. Рэпрэсіі ў адносінах да вучоных ў 30-я гг.
45. Культура Савецкай Беларусі 1920–1930-х гг.
46. Мастацтва Савецкай Беларусі 1920–1930-х гг.
47. Карэнныя змены грамадска-палітычнага жыцця ў канцы 20-х гг.. Умацаванне таталітарнай тэндэнцыі ў палітыцы Кампартыі.
48. Рэпрэсіі 20–30-х гг. у Савецкай Беларусі.
49. Пераход да барацьбы з беларускім нацыянал-дэмакратызмам (нацдэмамі). Справа «Саюза вызвалення Беларусі».
50. Масавы характар рэпрэсій 1937–1938 гг. у Беларусі. Рэпрэсіі ўнутры КП(б)Б. Трагічны лёс кіраўнікоў рэспублікі.

51. Беларускае замежжа 20–30-х гг. XX ст. Беларуская эміграцыя як частка беларускай нацыі. З’яўленне арганізаванай палітычнай эміграцыі, яе памеры і асноўныя накірункі.
52. Рух за вяртанне. Уключэнне былых эмігрантаў у нацыянальна-культурнае адраджэнне на савецкай частцы Беларусі. Рэпрэсіі ў адносінах да беларускіх дзеячаў, якія вярнуліся з эміграцыі.
53. Кіруючыя органы беларускай эміграцыі ў другой палове 20-х і ў 30-я гг. XX ст. Нацыянальна-культурная дзейнасць беларускай эміграцыі. Выдавецкая дзейнасць.
54. Заходняя Беларусь ў складзе польскай дзяржавы.
55. Стан прамысловасці на Заходняй Беларусі ў 20–30-я гг. XX ст.
56. Стан сельскай гаспадаркі на заходнебеларускіх землях у 20–30-я гг. XX ст. Вынікі калектывізацыі сельскай гаспадаркі Беларусі.
57. Грамадска-палітычнае жыццё на Заходняй Беларусі ў 20–30-я гг.
58. Адукацыя ў Заходняй Беларусі ў 1920–1930-я гг.
59. Культура ў Заходняй Беларусі ў 1920–1930-я гг.
60. Барацьба працоўных Заходняй Беларусі за нацыянальнае і сацыяльнае вызваленне.

**Метадычныя рэкамендацыі па арганізацыі і выкананні самастойнай работы студэнтаў па вучэбнай дысцыпліне «Гісторыя Беларусі (1918-1939 гг.)»**

Мэтай метадычных рэкамендацый з’яўляецца павышэнне эфектыўнасці вучэбнага працэсу, у тым ліку за кошт самастойнай работы, падчас якой студэнт становіцца актыўным суб’ектам навучання, што азначае:

— здольнасць займаць у навучанні актыўную пазіцыю;

— падрыхтаванасць да мабілізацыі інтэлектуальных і валявых намаганняў для дасягнення вучэбных мэт;

— уменні праектаваць, планаваць і прагназаваць вучэбную дзейнасць, а таксама ініцыяваць сваю пазнавальную дзейнасць на падставе ўнутранай станоўчай матывацыі;

— усведамленне сваіх патэнцыяльных вучэбных магчымасцей і псіхалагічную падрыхтаванасць да складання праграмы дзейнасці па самаразвіцці.

**Віды самастойнай работы студэнтаў**

| | |
|---|---|
| Рэпрадуктыўная самастойная работа | Самастойнае чытанне, прагляд, канспектаванне вучэбнай літаратуры, запамінанне, пераказ, паўтарэнне вучэбнага матэрыялу і г. д. |
| Пазнавальна-пошукавая самастойная работа | Падрыхтоўка паведамленняў, дакладаў, выступленняў на семінарскіх і практычных занятках, падбор адпаведнай літаратуры, напісанне курсавых, дыпломных работ і г. д. |
| Творчая самастойная работа | Удзел у навукова-даследчай рабоце, навуковых мерапрыемствах, выкананне творчых праектаў па індывідуальных і групавых заданнях і г. д. |

**Арганізацыя і кантроль самастойнай работы**

Для паспяховага выканання самастойнай работы студэнтаў неабходна планаванне і кантроль з боку выкладчыкаў. Аўдыторная самастойная работа выконваецца студэнтамі на лекцыях і семінарскіх занятках. Для гэтага выкладчык загадзя распрацоўвае і рэалізуе сістэму самастойнай работы, улічваючы ўсе яе формы, мэты, ажыццяўляе адбор неабходнай інфармацыі і сродкаў (метадчных) камунікацый, вызначае ролю студэнта ў гэтым працэсе і свой удзел у ім. Пытанні для самастойнай работы студэнтаў, якія прыведзены ў вучэбнай праграме дысцыпліны, прапаноўваюцца выкладчыкамі напачатку вывучэння дысцыпліны. Студэнты маюць права дадаткова выбіраць тэмы, якія іх цікавяць, для самастойнай работы.

**Змест дзейнасці выкладчыка і студэнта пры выкананні самастойнай работы**

| Асноўныя характарыстыкі | Дзейнасць выкладчыка | Дзейнасць студэнтаў |
|---|---|---|
| Мэта выканання СР | - тлумачыць мэту і сэнс выканання СР;<br>- дае разгорнуты ці кароткі інструктаж пра патрабаванні, якія прад'яўляюцца да СР і спосабах яе выканання;<br>- дэманструе ўзор СР | - асэнсоўвае і прымае мэту СР як асабіста значную;<br>- знаёміцца з патрабаваннямі да СР |
| Матывацыя | - раскрывае тэарэтычную і практычную значнасць выканання СР, фарміруе ў студэнта пазнавальную патрэбнасць і падрыхтаванасць да выканання СР;<br>- надае студэнту матывацыю для дасягнення поспеху | - фарміруе ўласную пазнавальную патрэбнасць у выкананні СР;<br>- фарміруе ўстаноўку і прымае рашэнне аб выкананні СР |
| Кіраванне | - ажыццяўляе кіраванне шляхам мэтанакіраванага ўздзеяння на працэс выканання СР;<br>- дае агульныя арыенціры выканання СР | - ажыццяўляе планаванне і праектаванне СР, а таксама рацыянальнае размеркаванне часу, неабходнага для яе выканання |
| Кантроль і карэкцыя выканання СР | - ажыццяўляе папярэдні кантроль, які прадугледжвае выяўленне зыходнага ўзроўню падрыхтаванасці студэнта да выканання СР;<br>- ажыццяўляе кантроль канчатковых вынікаў выканання СР | - ажыццяўляе бягучы самакантроль за ходам выканання СР;<br>- выяўляе, аналізуе і выпраўляе дапушчаныя памылкі і ўносіць карэктывы ў работу;<br>- праводзіць пошук аптымальных спосабаў выканання СР;<br>- ажыццяўляе рэфлексію ўласнай дзейнасці;<br>- ажыццяўляе самакантроль вынікаў СР |
| Ацэнка | - на падставе параўнання вынікаў з эталонам, загадзя зададзенымі крытэрыямі дае ацэнку СР;<br>- выяўляе тыповыя памылкі, | - на падставе параўнання вынікаў з мэтай дае самаацэнку сваім пазнавальным магчымасцям, |

| | | |
|---|---|---|
| | акцэнтуе ўвагу на станоўчых і адмоўных баках, дае метадычныя парады па выкананні СР, вызначае далейшыя кірункі выканання СР;<br>- устанаўлівае ўзровень і вызначае якасць самастойнай дзейнасці студэнта, на падставе чаго фарміруе ў апошняга матывацыю дасягнення поспеху ў вучэбнай дзейнасці | здольнасцям і якасцям |

Пазааўдыторная самастойная работа студэнтаў (далей – самастойная работа) – вучэбная, вучэбна-даследчая, навукова-даследчая дзейнасць студэнтаў, якая ажыццяўляецца ў пазааўдыторны час па заданні і пры метадычным кіраўніцтве выкладчыка. Яна прадугледжвае:

– падрыхтоўку да аўдыторных заняткаў і выкананне адпаведных заданняў;

– самастойную работу па вывучэнні тэм вучэбных дысцыплін у адпаведнасці з вучэбнымі праграмамі;

– падрыхтоўка дакладаў, эсэ;

– выкананне кантрольных і курсавых работ;

– падрыхтоўку да кантрольных выпрабаванняў, у тым ліку да комлекснага экзамена;

– удзел у навуковых мерапрыемствах (выставы, канферэнцыі, сімпозіумы, семінары і г. д.).

Выкананне студэнтамі любога віда самастойнай работы прадугледжвае наступныя этапы:

– пастаноўка мэты самастойнай работы;

– канкрэтызацыя пазнавальнай задачы;

– самаацэнка падрыхтаванасці да самастойнай работы па вырашэнні пастаўленай задачы;

– выбар адпаведных сродкаў вырашэння пастаўленай задачы;

– планаванне самастойнай работы па вырашэнні задач самастойна альбо пры дапамозе выкладчыка;

– рэалізацыя праграмы выканання самастойнай работы.

Патрабаванні да выканання самастойнай работы студэнтаў

| № п/п | Назва тэмы, раздзела | Колькасць гадзін на СРС | Заданне | Форма выканання |
|---|---|---|---|---|
| 1 | **Утварэнне БССР** | 6 | **Падрыхтоўка дакладаў па наступных пытаннях:** Гістарыяграфія пытання. Палітычныя перадумовы стварэння беларускай савецкай дзяржаўнасці. Роля Беларускага нацыянальнага камісарыята пры Наркамаце па справах нацыянальнасцеў РСФСР і беларускіх секцый ў РКП(б). Пазіцыя па беларускім пытанні Аблвыканкамзаха і Паўночна-заходняга абласнога камітэта РКП(б). Супярэчнасці працэсу станаўлення беларускай савецкай дзяржаўнасці. Прынясце вышэйшымі партыйнымі органамі рашэння аб стварэнні БССР. VI абласная канферэнцыя бальшавіцкай партыі. Абвяшчэнне БССР. Прынясце рашэння аб стварэнні Літоўска-Беларускай ССР (ЛітБел). Скасаванне Літоўска-Беларускай ССР. Сацыяльна-эканамічныя пераўтварэнні на савецкай частцы тэрыторыі Беларусі ў 1918–1920 гг. Палітыка «ваеннага камунізму» і асаблівасці яе ажыццяўлення. | Даклад |
| 2 | **Савецка-польская вайна на тэрыторыі Беларусі** | 4 | **Падрыхтоўка прэзентацый:** Наступленне польскіх войскаў, акупацыя тэрыторыі Беларусі. Палітыка польскага кіраўніцтва ў дачыненні да БНР, беларускага нацыянальнага руху. Раскол у беларускім грамадска-палітычным руху па пытаннях рэалізацыі ідэі беларускай дзяржаўнасці. Арганізацыя «Маладая Беларусь». Стварэнне Беларускай камуністычнай арганізацыі. У.Ігнатоўскі. Супраціўленне беларускага народа польскім акупантам. Беларускі паўстанчы камітэт і падрыхтоўка паўстання. Народная ваенная самаахова (НВС). | Прэзентацыя |
| 3 | **Аднаўленне савецкай улады на вызваленай тэрыторыі** | 4 | **Падрыхтоўка дакладаў па наступных пытаннях:** Слуцкае паўстанне. Барацьба супраць савецкай улады атрадаў С.Булак-Балаховіча. Ліквідацыя фарміраванняў | Даклад |

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| | | | С.Булак-Балаховіча, іншых антысавецкіх выступленняў. Заканчэнне савецка-польскай вайны на тэрыторыі Беларусі. Няўдачы Чырвонай Арміі на завяршальным этапе вайны. Рыжскі мірны дагавор і яго вынікі для Беларусі. | |
| 4 | **Умовы пераходу ад вайны да міру. Нацыянальна-дзяржаўнае будаўніцтва** | 4 | **Індывідуальныя заданні па наступных пытаннях:** Эканамічнае і палітычнае становішча Беларусі пасля заканчэння вайны, на пачатку 20-х гг.. Крызіс палітыкі «ваеннага камунізму”. Абвастрэнне сацыяльнай напружанасці. Антысавецкая барацьба ў памежных з Польшчай раёнах. Падрыхтоўка антыбальшавіцкага і антыпольскага паўстання. Увядзенне ваеннага становішча ў Беларусі. Падаўленне антысавецкіх выступленняў. Тэрыторыя і насельніцтва БССР у пачатку 20-х гг. Нацыянальны склад насельніцтва. Міграцыя насельніцтва, эвакуацыя і рээвакуацыя. Нелегальныя гандлёвыя зносіны, кантрабанда. Абмежаванасць эканамічных магчымасцей савецкай улады, матэрыяльных рэсурсаў. Фарміраванне гандлёва-прамысловай буржуазіі і прамысловага пралетарыяту. Іх нацыянальны склад. Становішча прамысловых рабочых. | Справаздача па індывідуальных заданнях |
| 5 | **Прамысловасць Беларусі ў 20–30-я гг. XX ст.** | 4 | **Індывідуальныя заданні па наступных пытаннях:** Змены ў арганізацыі кіравання прамысловымі прадпрыемствамі ва ўмовах іх дзейнасці пры пераходзе да НЭПу. Ліквідацыя главкаў і стварэнне трэстаў, сіндыкатаў. Перавод прамысловасці на гаспадарчы разлік. Арэнда прамысловых прадпрыемстваў. Асноўныя галіны прамысловасці Беларусі. Галоўныя вынікі аднаўленчага перыяду ў прамысловасці. Першы пяцігадовы план у прамысловасці Беларусі. З’яўленне новых галін вытворчасці. Вяртанне да камандна-адміністрацыйнай сістэмы, жорсткага планавання. Прамысловасць Беларусі ў гады другой пяцігодкі. Заданні па прамысловым развіцці. Новабудоўлі, тэхнічная рэканструкцыя вытворчасці. Абвастрэнне | Справаздача па індывідуальных заданнях |

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| | | | цяжкасцей з выкананнем пяцігадовага плана. Зніжэнне тэмпаў развіцця ў БССР. Асноўныя вынікі II пяцігодкі ў Беларусі. Прамысловасць Беларусі ў агульнасаюзным гаспадарчым комплексе. | |
| 6 | **Сельская гаспадарка Беларусі ў 20–30-я гг. ХХ ст.** | 4 | **Падрыхтоўка прэзентацый:**<br>Пераход да новай эканамічнай палітыкі. Замена харчразвёрсткі харчовым падаткам. Дэкрэт аб вольным выбары формаў землекарыстання. Хутары ў Беларусі. Калектыўнае землекарыстанне. Закон Аб арэндзе зямлі. Дазвол найму рабочай сілы. Рост крэдытнай спажывецкай кааперацыі. Вынікі НЭПа ў сельскай гаспадарцы. Змена палітыкі камуністычнай партыі ў вёсцы. Курс на калектывізацыю. «Раскулачванне», прымусовыя высылкі, рэпрэсіі. Арганізацыя МТС. Голад 1932–1933 гг. у Беларусі. Вынікі калектывізацыі сельскай гаспадаркі Беларусі. | Прэзентацыя |
| 7 | **Грамадска-палітычнае жыццё Беларусі ў 20–30-я гг. ХХ ст.** | 4 | **Падрыхтоўка дакладаў па наступных пытаннях:**<br>Праявы дэмакратызму ў дзейнасці грамадска-палітычных арганізацый у першай палове 20-х гг.. Прафесійныя саюзы Беларусі. Утварэнне камсамола ў Беларусі. Кампартыя Беларусі ў 20-я гг.. Палітыка беларусізацыі ў дзейнасці дзяржаўных і грамадскіх арганізацый. Перавод на беларускую мову справаводства ў дзяржаўных установах. Палітыка карэнізацыі. Праявы палітыкі беларусізацыі ў войску. Супярэчнасці і цяжкасці ў правядзенні палітыкі беларусізацыі. Змены палітыкі Кампартыі ў адносінах да беларусізацыі ў канцы 20-х гг. Карэнныя змены грамадска-палітычнага жыцця ў канцы 20-х гг. Умацаванне таталітарнай тэндэнцыі ў палітыцы Кампартыі. Тэзіс аб узмацненні класавай барацьбы. Пашырэнне барацьбы з іншадумствам. | Даклад |
| 8 | **Культурнае жыццё ў БССР** | 6 | **Падрыхтоўка прэзентацый:**<br>Уплыў палітыкі беларусізацыі на актывізацыю нацыянальна-культурнага жыцця. Станаўленне і развіццё ў Беларусі | Прэзентацыя |

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| | | | савецкай сістэмы адукацыі. Барацьба з непісьменнасцю. Стварэнне агульнаадукацыйнай, спецыяльнай і вышэйшай школы. Праявы палітыкі беларусізацыі ў сферы адукацыі. Забеспячэнне культурных патрэб нацыянальных меншасцей. Фарміраванне беларускай інтэлігенцыі і рэпрэсіі ў адносінах да яе. Развіццё беларускай савецкай літаратуры. Умовы літаратурнай дзейнасці ў пачатку 20-х гг. Праявы адноснай дэмакратызацыі грамадска-палітычнага жыцця ў творчай дзейнасці. Тэатральнае, музычнае і выяўленчае мастацтва Савецкай Беларусі. Рэпертуар тэатраў у Беларусі, тэматыка твораў мастакоў, кінарэжысёраў. Культурна-асветніцкая праца. Беларуская народная творчасць. Абмежаванасць працэсу нацыянальнага культурнага развіцця ў 30-я гг. | |
| 9 | **Навука і адукацыя ў 20–30-я гг. XX ст.** | 4 | **Падрыхтоўка прэзентацый:**<br>Стварэнне сістэмы навуковых устаноў. Заснаванне і дзейнасць Інбелкульта. Разгортванне навуковых даследаванняў па пытаннях беларускай мовы, гісторыі, этнаграфіі. Стварэнне Акадэміі навук БССР. У. Ігнатоўскі, С.Некрашэвіч, В.Ластоўскі, У.Пічэта, І.Замоцін і іншыя вучоныя Беларусі. Галоўныя навуковыя цэнтры Беларусі ў 30-я гг.. Здабыткі і страты беларускай навукі. Рэпрэсіі ў адносінах да вучоных. | Прэзентацыя |
| 10 | **Беларускае замежжа ў міжваенны перыяд** | 4 | **Індывідуальныя заданні па наступных пытаннях:**<br>Адносіны беларускай эміграцыі да савецкай Беларусі. Кантакты кіраўнікоў БССР з эміграцыяй. Уплыў амністыі, палітыкі беларусізацыі, гаспадарчых поспехаў у БССР на пазіцыі беларускай эміграцыі. Раскол у беларускай эміграцыі. Уключэнне былых эмігрантаў у нацыянальна-культурнае адраджэнне на савецкай частцы Беларусі. Рэпрэсіі ў адносінах да беларускіх дзеячаў, якія вярнуліся з эміграцыі. Кіруючыя органы беларускай эміграцыі ў другой палове 20-х і ў 30-я гг. XX ст.. Нацыянальна-культурная дзейнасць беларускай эміграцыі. Выдавецкая дзейнасць. | Справаздача па індывідуальных заданнях |

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| | | | Студэнцкія аб’яднанні. Роля беларускай эміграцыі ў захаванні нацыянальнай спадчыны. | |
| 11 | **Заходняя Беларусь у складзе Польскай дзяржавы** | 4 | **Падрыхтоўка прэзентацый:**<br>Заходнебеларускія землі ў складзе Польскай дзяржавы. Палітыка польскіх улад у адносінах да Заходняй Беларусі, нацыянальных праблем беларусаў. Эканамічная эміграцыя. Нацыянальны прыгнёт беларускага насельніцтва. Стварэнне Беларускай рэвалюцыйнай арганізацыі (БРА). Беларуская сацыял-дэмакратычная партыя. Беларуская хрысціянская дэмакратыя. Беларускі сялянскі саюз (БСС). Утварэнне камуністычнай партыі Заходняй Беларусі (КПЗБ). Афармленне Беларускай сялянска-рабочай грамады (БСРГ). Яе праграма, палітычная і арганізацыйная дзейнасць. Пераўтварэнне грамады ў масавую арганізацыю. Б.Тарашкевіч, С.Рак-Міхайлоўскі, П.Валошын, П.Мятла і іншыя кіраўнікі Беларускага нацыянальнага руху. Разгром і забарона БСРГ польскімі ўладамі. Выбары ў сейм (1928 г.) у Заходняй Беларусі. Беларускі сялянска-рабочы пасольскі клуб «Змаганне» Спробы стварэння антыфашысцкага народнага фронту. Беларускае народнае аб’яднанне (БНА). Роспуск КПЗБ, рэпрэсіі ў адносінах да яе кіраўнікоў. | Прэзентацыя |
| **Усяго** | | **48** | | |

## Пералік заданняў і кантрольных мерапрыемстваў кіруемай самастойнай работы студэнта

| № п/п | Назва тэма | лекцыі | семінары | Від заданняў | Форма кантролю |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | **Утварэнне БССР** | | 2 | **Першы модуль**<br>**Падрыхтаваць даклад на тэму:**<br>1. Перадумовы стварэння беларускай савецкай дзяржаўнасці.<br>2. Роля Беларускага Нацыянальнага камісарыята.<br>3. IV Абласная канферэнцыя бальшавіцкай партыі. Абвяшчэнне БССР. Утварэнне КП(б)Б.<br>4. Стварэнне Літоўска-Беларускай ССР. Скасаванне ЛітБел.<br>5. Сацыяльна-эканамічныя пераўтварэнні на савецкай частцы тэрыторыі Беларусі ў 1918–1920 гг. Палітыка «ваеннага камунізму».<br>6. Сялянскія хваляванні і антысавецкія выступленні.<br>**Другі модудь**<br>**На падставе зместу вучэбнай літаратуры і інтэрнет-рэсурсаў падрыхтаваць прэзентацыю па тэме** «Утварэнне БССР»<br>**Трэці модуль**<br>**Падрыхтаваць эсэ на тэму:**<br>Сацыяльна-эканамічныя пераўтварэнні на савецкай частцы тэрыторыі Беларусі ў 1918–1920 гг. Палітыка «ваеннага камунізму». | Даклад<br><br>Прэзентацыя<br><br>эсэ |
| 2 | **Навука і адукацыя ў 20–30-я гг. ХХ ст.**<br>1. Навука ў БССР.<br>2. Разгортванне навуковых даследаванняў.<br>3. Развіццё ў Беларусі савецкай | 2 | | **Першы модуль**<br>**На падставе зместу вучэбнай літаратуры і інтэрнет-рэсурсаў падрыхтаваць канспект па наступных пытаннях:**<br>1. Навука ў БССР ў 20–30-я гг. ХХ ст.<br>2. Разгортванне навуковых даследаванняў. ў 20–30-я гг. ХХ ст.<br>3. Развіццё ў Беларусі савецкай сістэмы адукацыі ў | Канспект |

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| | сістэмы адукацыі. | | | 20–30-я гг. XX ст.<br>**Другі модуль**<br>**На падставе зместу вучэбнай літаратуры і інтэрнет-рэсурсаў падрыхтаваць прэзентацыі па наступных пытаннях:**<br>Навука БССР ў 20–30-я гг. XX ст.<br>Адукацыя БССР ў 20–30-я гг. XX ст.<br>**Трэці модуль**<br>**Падрыхтаваць эсэ па тэме:**<br>Развіццё ў Беларусі савецкай сістэмы адукацыі ў 20–30-я гг. XX ст. | прэзентацыя<br>эсэ |
| **3** | **Заходняя Беларусь у складзе Польскай дзяржавы**<br>. | | 2 | **Першы модуль**<br>**На падставе зместу вучэбнай літаратуры і інтэрнет-рэсурсаў падрыхтаваць канспект па наступных пытаннях:**<br>1. Таварыства беларускай школы (ТБШ), яго культурна-асветніцкая дзейнасць. Беларускі пасольскі клуб.<br>2. Культура Заходняй Беларусі. Школы, друк, літаратура і мастацтва. 3 Творы М.Танка, М.Васілька, В.Таўлая, Я.Брыля, Б.Тарашкевіча, І.Дварчаніна і інш. Народная творчасць. Р.Шырма.<br>**Другі модуль**<br>**Зрабіць карту «Заходняя Беларусь у складзе Польскай дзяржавы» з пісьмовымі каментарыямі.**<br>**Трэці модуль**<br>**Падрыхтаваць прэзентацыю на тэму:**<br>Палітычныя партыі Заходняй Беларусі. | Канспект<br>Карта<br>Прэзентацыя |
| **Усяго** | | **2** | **4** | | |

## Прыклады кампетэнтнасна-арыентаваных заданняў:

### Кампетэнтнасна-арыентаванае заданне № 1.

**Прачытайце дакумент. Параўнайце меркаванні Ю. Пілсудскага і М. Тухачэўскага.**

Характар польска-савецкай вайны па-рознаму тлумачыўся яе непасрэднымі ўдзельнікамі. **Ю. Пілсудскі** ў сваёй кнізе **«Вайна 1920 г.»** адзначаў «...Унутранай рэвалюцыі ў нас не існавала... яе трэба было прынесці звонку з дапамогай штыкоў... Савецкая Расія вяла з намі вайну пад лозунгам навязвання нам, палякам, свайго, г. зн. савецкага, ладу, і такую мэту яна назвала „рэвалюцыяй звонку“. ...Незалежна ні ад каго я паставіў сабе за выразную мэту... зрываць любыя спробы зноў навязаць нам чужое, не самімі палякамі ўладкаванае жыццё... я гэту задачу выканаў».

У сваю чаргу, **М. Тухачэўскі** ў кнізе **«Паход за Віслу»** занатаваў: «Няма чаго сумнявацца ў тым, што калі б толькі мы вырвалі з рук польскай буржуазіі яе буржуазную шляхецкую армію, то рэвалюцыя рабочага класа ў Польшчы стала б здзейсненым фактам. А гэты пажар не застаўся б абмежаваным польскімі рамкамі. Ён распаўсюдзіўся б бурлівым патокам па ўсёй Заходняй Еўропе. Гэты вопыт звонку Чырвоная Армія не забудзе. І калі еўрапейская буржуазія выкліча нас на новы бой, то Чырвоная Армія зможа яе разграміць і рэвалюцыю ў Еўропе падтрымае і распаўсюдзіць».

### Кампетэнтнасна-арыентаванае заданне № 2.

**Прачытайце дакумент. Вызначыце, у чым заключалася супярэчнасць прынятага на нарадзе пратаколу. Свой адказ аргументуйце.**

24 снежня 1918 г. Цэнтральны камітэт Расійскай Камуністычнай партыі (бальшавікоў) - ЦК РКП(б) пад уплывам У. І. Леніна прыняў рашэнне аб неабходнасці стварэння беларускай савецкай дзяржавы. На наступны дзень у мэтах ажыццяўлення гэтай пастановы адбылася нарада ў народнага камісара па справах нацыянальнасцяў І. В. Сталіна.

У **пратаколе нарады** адзначалася, што ў сувязі з «современными международными отношениями и с целью укрепления и расширения завоеваний социалистической революции в мировом масштабе в данный момент полностью созрела необходимость объявления Белоруссии как самостоятельной во всех отношениях нации, независимой Социалистической Советской Республики».

Кіраўніцтва РКП(б) было перакананa, што чалавецтва знаходзіцца напярэдадні сусветнай пралетарскай рэвалюцыі. Таму рашэнне аб стварэнні беларускай савецкай дзяржавы прымалася цэнтральным партыйным кіраўніцтвам, зыходзячы перш за ўсё з палітычных меркаванняў.

## Метадычныя парады і рэкамендацыі да заданняў

Усе тыпы заданняў, што выконваюцца студэнтамі, у тым ліку ў працэсе самастойнай работы, так ці інакш ўтрымліваюць устаноўку на набыццё і замацаванне вызначанага Дзяржаўным адукацыйным стандартам вышэйшай прафесійнай адукацыі аб'ёму ведаў, а таксама на фарміраванне ў рамках гэтых ведаў некаторых навыкаў разумовых аперацый – уменне ацэньваць, аналізаваць, параўноўваць, каментаваць і г. д. Некаторыя заданні патрабуюць тлумачэння:

1. Пракаментаваць выказванне – растлумачыць, якая ідэя заключана ва урыўку, аб якой пазіцыі яе аўтара яна сведчыць.

2. Параўнаць – выявіць падабенства і адрозненне па пэўных прыкметах.

3. Абгрунтаваць адзін з некалькіх прапанаваных варыянтаў адказу – прывесці аргументы на карысць правільнасці выбранага варыянту адказу і паказаць, у чым памылковасць іншых варыянтаў.

5. Правесці аналіз – раскласці вывучаемыя з'явы на складовыя часткі, супаставіць іх з мэтай выяўлення ў іх істотнага, неабходнага і вызначальнага.

6. Тэзісна выкласці ідэю, канцэпцыю, тэорыю – выкарыстоўваючы матэрыял вучэбных дапаможнікаў і іншай літаратуры, коратка, але не на шкоду зместу сфармуляваць асноўныя палажэнні.

7. Адлюстраваць схематычна – раскрыць змест адказу лаканічна, абагульнена, пры неабходнасці ў выглядзе розных графічных формаў (схема, табліца, малюнак і г. д.).

Важную ролю ў ажыццяўленні самастойнай пазааўдыторнай падрыхтоўкі адыгрывае праца з літаратурай да ўсіх відаў заняткаў: семінарскіх, практычных, пры падрыхтоўцы да экзамену, тэсціравання, падрыхтоцы прэзентацый, удзелу ў навуковых мерапрыемствах.

Уменне працаваць з літаратурай азначае навучыцца асэнсавана карыстацца крыніцамі. Перш чым прыступіць да засваення зместу спецыяльнай навуковай літаратуры, рэкамендуецца чытанне падручнікаў і вучэбных дапаможнікаў.

Вывучэнне навуковай, вучэбнай і іншай літаратуры патрабуе вядзення працоўных запісаў.

Формы запісаў могуць быць разнастайнымі: просты або разгорнуты план, тэзісы, цытаты, канспект.

Студэнтам рэкамендуецца самастойна выконваць даклады, прэзентацыі, індывідуальныя пісьмовыя заданні і практыкаванні, прапанаваныя пры падрыхтоўцы да семінарскіх заняткаў. Праца, звязаная з рашэннем гэтых задач і практыкаванняў, уяўляе сабой выгляд інтэлектуальнай практычнай дзейнасці. Яна спрыяе выпрацоўцы ўмення і звычкі выконваць задачы правільна, а таксама замацаванню навыкаў і ведаў па праблеме.

## Метадычныя рэкамендацыі па напісанні пісьмовых, навукова-даследчых работ студэнтаў

Напісанне пісьмовых, навукова-даследчых работ студэнтаў вырашае шэраг задач:

— навучанне студэнтаў самастойнаму пошуку і адбору вучэбнай і спецыяльнай навуковай літаратуры па прадмеце;

— выпрацоўка ўмення падрыхтоўкі паведамленняў, дакладаў і выступленняў, прэзентацый;

— набыццё вопыту выступленняў з дакладамі на семінарскіх занятках;

— сістэматызацыя, замацаванне і пашырэнне ведаў і навыкаў па вывучаемых дысцыплінах;

— далучэнне студэнтаў да вырашэння праблемных пытанняў па абранай тэме работы.

## Пералік сродкаў дыягностыкі вынікаў вучэбнай дзейнасці, якія выкарыстоўваюцца

Для дыягностыкі кампетэнцый выкарыстоўваюцца наступныя формы:
1. Вусная форма:
– гутарка;
– даклады на семінарах;
– прэзентацыі;
– экзамен.

2. Пісьмовая форма:
– тэсты;
– пісьмовыя кантрольныя работы;
– пісьмовы экзамен.

**Крытэрыі ацэнак вынікаў вучэбнай дзейнасці студэнта**

| Балы | Крытэрыі ацэнкі |
|---|---|
| **1** (адзін) | Адмова ад адказу, поўная адсутнасць прафесійных кампетэнцый. |
| **2** (два) | Фрагментарныя веды ў межах адукацыйнага стандарту; веданне асобных фактаў з гістарычных крыніц, якія рэкамендаваныя праграмай дысцыпліны; няздольнасць выкарыстоўваць навуковую тэрміналогію; пасіўнасць на семінарскіх занятках. |
| **3** (тры) | Адсутнасць поўнага аб'ёму ведаў у межах адукацыйнага стандарту; веданне часткі асноўнай літаратуры, якая рэкамендавана вучэбнай праграмай; значныя лінгвістычныя і лагічныя памылкі ў выкарыстанні навуковай тэрміналогіі; няздольнасць арыентавацца ў асноўных тэорыях і канцэпцыях дысцыпліны; пасіўнасць на семінарскіх занятках. |
| **4** (чатыры) | Дастатковы аб'ём ведаў у межах адукацыйнага стандарту; засваенне асноўнай літаратуры, якая рэкамендавана вучэбнай праграмай; уменне выкарыстоўваць навуковую тэрміналогію і рабіць высновы без істотных памылак; здольнасць арыентавацца ў асноўных тэорыях і канцэпцыях прадмета і даваць ім ацэнку; праца на семінарскіх занятках пад кіраўніцтвам выкладчыка. |
| **5** (пяць) | Дастатковы ўзровень ведаў у рамках вучэбнай праграмы; уменне карыстацца навуковай тэрміналогіяй, здольнасць рабіць высновы; валоданне асноўнымі тэорыямі дысцыпліны; засваенне асноўнай літаратуры, якая рэкамендавана вучэбнай праграмай, неістотныя памылкі пры выкананні вучэбных і прафесійных задач. |
| **6** (шэсць) | Сістэматызаваныя веды ў аб'ёме вучэбнай праграмы; выкарыстанне неабходнай навуковай тэрміналогіі; лагічна вытрыманыя адказы; уменне арыентавацца ў базавых тэрмінах і канцэпцыях дысцыпліны, даваць іх параўнальную ацэнку; самастойная праца на семінарскіх занятках, удзел у групавых абмеркаваннях, высокі ўзровень культуры выканання заданняў. |
| **7** **(сем)** | Сістэматызаваныя, глыбокія і поўныя веды па ўсіх раздзелах вучэбнай праграмы; выкарыстанне навуковай тэрміналогіі; лагічна вытрыманыя адказы, здольнасць рабіць абгрунтаваныя высновы; засваенне асноўнай і дадатковай літаратуры праграмы дысцыпліны; здольнасць арыентавацца ў асноўных тэорыях і даваць іх крытычную ацэнку; самастойная і актыўная праца на семінарскіх занятках |
| **8** **(восем)** | Сістэматызаваныя, глыбокія і поўныя веды па ўсіх пытаннях у аб'ёме вучэбнай праграмы; выкарыстанне навуковай тэрміналогіі; здольнасць рабіць абгрунтаваныя высновы; валоданне метадамі комплекснага аналізу і здольнасць самастойна вырашаць складаныя праблемы ў рамках вучэбнай праграмы; засваенне асноўнай і дадатковай літаратуры, якая рэкамендавана праграмай; |

| | |
|---|---|
| | здольнасць арыентавацца ў асноўных тэорыях і канцэпцыях і даваць ім крытычную ацэнку; актыўная самастойная праца на занятках, удзел у групавых абмеркаваннях |
| **9 (дзевяць)** | Выкананне патрабаванняў вучэбнай праграмы на высокім узроўні; поўнае і глыбокае засваенне асноўнай і дадатковай літаратуры па прадмеце; бездакорнае валоданне тэарэтычнымі ведамі і практычнымі навыкамі; стылістычна пісьменнае, лагічна правільнае прадстаўленне матэрыялу; дакладнае выкарыстанне навуковай тэрміналогіі, уменне арыентавацца ў тэорыях, канцэпцыях і накірунках вывучаемай дысцыпліны, даваць ім крытычную ацэнку, выкарыстоўваць змест іншых дысцыплін; уменне самастойна творча вырашаць складаныя праблемы ў нестандартнай сітуацыі; веданне і умелае выкарыстанне сучасных інфармацыйных і адукацыйных тэхналогій |
| **10 (дзесяць)** | Безумоўнае выкананне патрабаванняў вучэбнай праграмы на высокім узроўні; уменне самастойна выяўляць і выкарыстоўваць унутрыпрадметныя і міжпрадметныя сувязі вучэбнай дысцыпліны; свабоднае валоданне інфармацыяй з асноўных і дадатковых крыніц у вырашэнні прафесійных задач; пошукавая творчая дзейнасць па вырашэнні актуальных праблем вывучаемай дысцыпліны |

## ПРАТАКОЛ УЗГАДНЕННЯ ВУЧЭБНАЙ ПРАГРАМЫ

| **Назва вучэбнай дысцыпліны, з якой патрабуецца ўзгадненне** | **Назва кафедры** | **Прапановы аб зменах у змесце вучэбнай праграмы установы вышэйшай адукацыі па вучэбнай дысцыпліне** | **Рашэнне, прынятае кафедрай, якая распрацавала вучэбную праграму (з указаннем даты і нумару пратакола)** |
|---|---|---|---|
| Гісторыя Расіі і Украіны (1900–1917 гг.) | Гісторыі Беларусі і славянскіх народаў | Узгоднена на ўзроўні вучэбных праграм | Рэкамендавана да зацвярджэння вучэбная праграма ў прадстаўленым варыянце (пратакол № 9 ад 30.04.2022). |
| Гісторыя канфесій у Беларусі | Гісторыі Беларусі і славянскіх народаў | Узгоднена на ўзроўні вучэбных праграм | Рэкамендавана да зацвярджэння вучэбная праграма ў прадстаўленым варыянце (пратакол № 10 ад 21.03.2023). |